2022

Кастрычнік

# Бібліятэчны веснік

ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр
і сетка публічных бібліятэк”















**Інфармацыйны веснік**

# *Кастрычнік*

**10**

У нашай краіне разам са шматлікімі святамі і памятнымі датамі адзначаюць – Дзень пажылых людзей. Ён праходзіць у першы дзень кастрычніка. У бібліятэках Гарадоцкага раёна ў гэты дзень традыцыйна прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да добрага і светлага свята старэйшага пакалення.

**1 кастрычніка** ў Дзень пажылых людзей супрацоўнікі **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** наведалі спецыяльны дом для пражывання ветэранаў, састарэлых і інвалідаў з **акцыяй-віншаваннем “Согреем души тёплыми словами”.** У ПЦПІ бібліятэцы **адбыўся дзень прававой асветы “Пожилым забота, внимание и льгота”.** Карыстальнікі сталага ўзросту даведаліс аб льготах, якімі маюць права карыстацца прадстаўнікі старэйшага пакалення на тэрыторыі нашай краіны.

**1 кастрычніка** ў рамках мэтавай праграмы “Доброта приносит людям радость” у **Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** да Дня пажылых людзей прайшла **бібліясустрэча “Нам года лишь мудрости ступеньки”.** Жыхары вёскі залатога ўзросту ўдзельнічалі ў літаратурных віктарынах і конкурсах, спявалі прыпеўкі. Мерапрыемства скончылася чаяваннем.



**1 кастрычніка** супрацоўнікі **Бычыхінскай сельскай бібліятэкі** сумесна з



работнікамі ДУК "Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна" філіял Бычыхінскі сельскі дом культуры правялі **вечар успамінаў "От чистого сердца – простыми словами"**, прымеркаваны да Дня пажылых людзей. Акрамя шчырых віншаванняў людзей сталага ўзросту, на мерапрыемстве гучалі музычныя нумары і вершы.Таксама ў гэты дзень у Бычыхінскай сельскай бібліятэцы для чытачоў старэйшага пакалення прайшоў калейдаскоп інфармацыі "Цветы – улыбка природы". Размова ішла аб тым, як зберагчы найбольш пераборлівыя кветкі ў зімовы перыяд, якія работы для гэтага павінны быць праведзены ў восень. Затым бібліятэкар азнаёміла прысутных з пастулаючымі перыядычнымі выданнямі ў бібліятэку: "Цветок", "Я на пенсии", "Сад, огород – кормилец и лекарь", "Урожайные сотки" и др. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава "Все о цветах".




**6 кастрычніка** супрацоўнікі **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры** Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі запрасілі маленькіх выхаванцаў ДУА "Яслі-сад №3 г. Гарадка" на **літаратурнае свята "Усіх нас гадуюць матчыны казкі!".** Мерапрыемства было прысвечана беларускаму пісьменніку М. Танку. Бібліятэкар чытальнай залы зачытала дзецям вершаваныя казкі пісьменніка, расказала пра яго творчую дзейнасць, пра яго любоў да радзімы, да прыгожага, напеўнага роднага слова. З вялікім задавальненнем удзельнікі гулялі ў гульні, "Дудка", "Вясёлая полечка", адгадвалі беларускія загадкі, танчылі. А напрыканцы добрым сюрпрызам стаў паказ лялечнага спектакля "Вясёлы звярынец".

**7 кастрычніка** на Басвостраве ў Вараб'ёвых гарах адзначалі сваё прафесійнае свята работнікі культуры Гарадоччыны. На яго былі запрошаны ветэраны працы, работнікі бібліятэк, музея, дамоў культуры, сельскіх клубаў, маладыя спецыялісты. У пачатку мерапрыемства на сцэну запрасілі работнікаў, якія па выніках мінулага года заслужылі права ў 2022 годзе быць занесенымі на Дошку гонару аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, сярод іх тры бібліятэкара і адзін ветэран бібліятэчнай справы. Лепшых супрацоўнікаў бібліятэкі адзначылі ганаровымі дыпломамі і граматамі. Асаблівыя словы ўдзячнасці прагучалі і ў адрас ветэранаў. Малады спецыяліст, трымаючы руку на самай старой кнізе цэнтральнай раённай бібліятэкі, вымавіла клятву і была сардэчна “прынята ў бібліятэчную сям’ю”. Новага работніка на сцэне падтрымала дырэктар установы А. Абрамава. Працягнулася свята культработнікаў гумарыстычнай спартландыяй і канцэртнай праграмай.



З **8 кастрычніка** на абанеменце **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** была аформлена **выстава-агляд “В мире цветаевской поэзии”,** якая дзейнічала да канца месяца. Бібліятэкары расказвалі карыстальнікам аб жыццёвым лёсе і творчасці рускай паэткі Сярэбранага веку, празаіка, перакладчыцы Марыі Цвятаевай. Знаёмілі з кнігамі з фонду бібліятэкі: паэтычнымі зборнікамі, успамінамі родных паэткі.






Бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі 12 кастрычніка** запрасіла маленькіх карыстальнікаў на **займальную гадзіну “Ребятам о зверятах”.** Сусветны дзень абароны жывёл – выдатная нагода расказаць дзецям аб дзіўным свеце братоў нашых меншых. Да мерапрыемства была аформлена **выстава-прагляд** “**Знакомые незнакомцы**”, з кніг прадстаўленных на якой дзеці даведаліся шмат цікавых фактаў з жыцця жывёл.

**13 кастрычніка** аддзел **дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** наведалі выхаванцы ДУА “Яслі-сад №3 г. Гарадка”. Для іх прайшло **свята “Усе мы жывём пад зоркамі матуль”.** Дзеці з задавальненнем пачыталі вершы, прыпомнілі казкі, якія чытаюць ім матулі, пагулялі ў гульні: “Прыбяры мяне хутчэй, “Развесь бельё быстро, как мама”, “Загадалкі”, “Мая мамачка самая, самая...”. У канцы свята дзяцей парадаваў **лялечны спектакль “Подарок маме”.** Да мерапрыемства была падрыхтавана **выстава “С мамой по книжной вселенной”.**






**13 кастрычніка** напярэдадні Дня Маці ў літаратурна-музычнай гасцёўні **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшло **святочнае мерапрыемства** “**Любовью материнской мы согреты**”, на якое былі запрошаны ўдзельнікі клуба “Золотой возраст”, жыхары горада і навучэнцы ўстаноў адукацыі г. Гарадка. Са сцэны гучалі цёплыя словы віншаванняў ад вядучых мерапрыемства і гасцей. Іерэй Храма Святой Жываначальнай Тройцы айцец Вячаслаў расказаў прысутным аб праваслаўным свяце Пакрове Прасвятой Багародзіцы, якое адзначаецца ў адзін дзень з Днём маці. Таксама віншаванні прагучалі ад старшыні Гарадоцкай раённай арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў Вячаслава Аляксандравіча Ільіна. Паэт, празаік, публіцыст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы Наталля Віктараўна Саветная падарыла гасцям свята свае вершы пра маці і бабулю. Дзяліліся сваей творчасцю і паэты-аматары Гарадоччыны Алеся Папова і Таццяна Паўлоўская. А музычныя віншаванні гучалі ад удзельнікаў вакальных калектываў ДУА “Дзіцячая школа мастацтваў г.Гарадка” і ДУК “Гарадоцкі гарадскі Дом культуры”У завяршэнні свята ўсім жанчынам падарылі восеньскія букеты ў знак падзякі і ўдзячнасці за іх клопат і каханне, з пажаданнямі шчасця, здароўя, кахання і дастатку. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстава-віншаванне “Все краски жизни для тебя…”.










**11 кастрычніка ў Сцяпанавіцкай сельскай бібліятэцы** напярэданні Дня маці сабраліся маленькія чытачы на **майстрылку “Букет любви и ласки”**, каб сваими рукамі зрабіць падарункі для сваіх любімых матуль. Дзеці не толькі выразалі і клеілі прыгожыя кветкі з каляровай паперы, але і размаўлялі аб сваіх родных і любімых мамах.



**14 кастрычніка ў Руднянскай бібліятэцы-клубе** адбылася **літаратурна-музычная вечарына “Вечный огонь материнской любви”** для ўдзельнікаў бібліятэчнага клуба “Мои года, моё богатство”, прымеркаваная да Дня маці. У адрас прысутных жанчын гучала шмат добрых слоў віншавання. За чаяваннем удзельнікі чыталі вершы, спявалі прыгожыя песні. У канцы мерапрыемства ўсе атрымалі кветкі і падарункі.



**Урок дабрыні,** прымеркаваны да Дня маці пад назвай **“Пра маці з любоўю, павагай, пяшчотай”** прайшоў у **Дубраўскай сельскай бібліятэцы 14 кастрычніка.** Дзеці расказвалі пра сваіх любімых матуль, чыталі вершы.




**14 кастрычніка,** у Дзень маці, бібліятэкар **Межанскай сельскай бібліятэкі** правяла **агляд выставы-ілюстрацыі “Парад сказочных Мам”.** На выставе былі прадстаўлены самыя кранальныя і добрыя кнігі аб мамах, якія бібліятэкар рэкамендавала прачытаць дзецям.




**14 кастрычніка ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшла **Акцыя “Чытаем творы беларускіх пісьменнікаў пра маці”,** у якой прынялі ўдзел маленькія чытачы. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з творамі вядомых беларускіх пісьменнікаў: П. Броўкі, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Я. Брыля, І. Шамякіна і іншыя. Дзеці зачыталі радкі вершаў, якія ім вельмі спадабаліся.



**14 кастрычніка** бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** правяла для маленькіх карыстальнікаў **святочны калейдаскоп “Поговорим сегодня мы о маме”,** прысвечаны Дню маці. Дзеці чыталі вершы, выконвалі песні, узгадалі прымаўкі пра маму. З любоўю і павагай расказвалі пра сваіх маці і прыгатавалі падарункі сваімі рукамі.



**14 кастрычніка ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы** была праведзена **літаратурна-паэтычная гадзіна “Ты одна такая - любимая, родная”,** прысвечаная Дню Маці. З дзецьмі была праведзена гутарка аб ролі маці ў сям'і і грамадстве, аб тым што маці дорыць дзіцяці пачуццё кахання, пяшчоты і абароненасці. Гучалі вершы прысвечаныя маці. Прысутныя расказалі пра сваіх маці, пра клопат і дапамогу мамам. У канцы мерапрыемства быў праведзены майстар-клас па вырабе восеньскіх букетаў для маці.



**14 кастрычніка** бібліятэкар **Прудніцкай сельскай бібліятэкі** правяла **краязнаўчае падарожжа "Память в наших сердцах",** прымеркаванае да Года ггістарычнай памяці для ўдзельнікаў пасяджэння метадычнага аб'яднання прыёмных бацькоў і бацькоў-выхавальнікаў арганізаванага аддзелам адукацыі Гарадоцкага райвыканкама. Пачалося мерапрыемства каля абеліска землякам у вёсцы Пруднікі, дзе прысутныя даведаліся пра подзвігі мясцовых жыхароў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Затым экскурсія працягнулася ў запаведніку прыроды Дубрава, дзе прысутныя дазналіся пра гісторыю Прудніцкага краю, легенды і загадкі возера Лосвіда. Скончылася мерапрыемства наведваннем ТАК "Лосвіда".







**18 кастрычніка** ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы прайшла **гадзіна творчасці "Марина Цветаева: жизнь и судьба"**, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння вялікай рускай паэткі XX стагоддзя. Бібліятэкар расказала чытачам бібграфію паэтэсы, пазнаёміла з вершамі.

**20 кастрычніка** ўдзельнікі клуба "Пазнавайка" прыйшлі ў **Дубраўскую сельскую бібліятэку,** каб прыняць удзел у **прэс-падарожжы "Детские журналы – твои надёжные друзья".** Падчас мерапрыемства дзеці не толькі пазнаёміліся з разнастайнасцю перыёдыкі, якую прапануе бібліятэка, але і расказалі сябрам пра свае любімыя выданні. Усё праходзіла ў гульнявой форме, што вельмі спадабалася ўдзельнікам мерапрыемства.



**20 кастрычніка** супрацоўнікамі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** для юных чытачоў быў арганізаваны **бібліятэчны мікс “Папа, мама, я – дружная семья”.** Падчас мерапрыемства бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з новым святам, якое стала адзначацца ў нашай краіне – Дзень бацькі. Дзеці гулялі ў розныя гульні, складалі свае поўныя імёны і даведаліся крыху пра свае прозвішчы, слухалі вершы пра бацькоў, разгадвалі загадкі. Таксама для прысутных была праведзена міні-экскурсія ў імправізаваную старадаўнюю хату, дзе дзеці даведаліся аб значэнні шматлікіх старадаўніх рэчаў у побыце.



**21 кастрычніка** ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшла **сямейная сустрэча “Отец - мой лучший друг”**, прымеркаваная да Дня бацькі. На мерапрыемства прыйшлі маленькія чытачы разам са сваімі татамі. Бібліятэкар павіншавала прысутных з новым цудоўным святам, якое адзначаецца ўпершыню ў нашай краіне. Затым дзеці і іх бацькі ўдзельнічалі ў конкурсах: “Помощники”, “Собери дочку в школу”, “Отгадай загадку” і інш. Была аформлена кніжная выстава “Отец – главная сила и опора”.



**27 кастрычніка** супрацоўнік **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** сабрала маленькіх чытачоў у **інтэлектуальным кафэ “Лістападнік”.** Прысутным бібліятэкар прапанавала меню з жартоўнымі конкурсамі і сур'ёзнымі заданнямі. Першая страва: “Добры дзень, восень” – дзеці чыталі і слухалі вершы аб восені. Другая страва: “Ураджайная” – прысутныя адгадвалі загадкі аб гароднiне і садавіне. Трэцяя страва: “У гасцях у восеньскіх месяцаў” – удзельнікі з прапанаваных слоў складалі прыказкі аб кожным восеньскім месяцы. Заключнае страва: “Хлеб усяму галава” – дзеці з цікавасцю слухалі расказ вядучых аб тым, што Хлеб – сімвал дастатку і дабрабыту. Хлеб берaглі, у гонар хлеба складалі песні, хлебам-соллю сустракалі гасцей.

**26 і 27 кастрычніка** ва ўстановах адукацыі горада для навучэнцаў старэйшых класаў школ горада прайшоў **інфармацыйны ўрок “Государственная система правовой информации”,** які правялі супрацоўнікі **Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі.** Прысутныя даведаліся, што ў мэтах забеспячэння рэалізацыі права грамадзян на атрыманне поўнай дакладнай і своечасовай прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь створана дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі. Адным з яе элементаў з'яўляюцца публічныя цэнтры прававой інфармацыі, якія ствараюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь на базе публічных бібліятэк. У цяперашні час такія цэнтры інфармацыі існуюць на базе Гарадоцкай раённай бібліятэкі, і ў бібліятэках-філіялах Гарадоцкага раёна. Бібліятэкар расказала прысутным аб мэтах і магчымасцях Публічнага цэнтра прававой інфармацыі, яго рэсурсах. Разам з вучнямі прайшлі па старонках **“Детского правового сайта”**. Школьнікі актыўна ўключаліся ў дыялог, задавалі пытанні па прававой тэматыцы.





**28 кастрычніка** ў аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылося чарговае паседжанне клуба “Неугомонные детки”. Мерапрыемства прайшло ў форме **квэст-гульні па прафарыентацыі “В мире профессий”.** У рамках гульні дзеці падзяліліся на дзве каманды і па маршрутным лістам праходзілі шэсць станцый: “Профессии сказочных героев”, “Профессии родителей”, “Мозаика профессий”, “Спасательная”, “Отгадай профессию”, “Угадай кто?”. На кожнай станцыі каманды атрымлівалі свае конкурсы, віктарыны ці пэўныя заданні.



**28 кастрычніка** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** адбылося чарговае паседжанне клуба “Правовед” – гадзіна **прававой асветы “Ребёнок, подросток, гражданин”.** Размова ішла аб правах дзіцяці, а таксама пра тое, што за правіны маленькіх дзяцей, нясуць адказнасць бацькі, а чым старэйшы чалавек становіцца тым больш ён сам нясе адказнасці перад законам і дзяржавай.

**28 кастрычніка** ў **Верамееўскай сельскай бібліятэцы** прайшло паседжанне клуба “Почемучки” – **гутарка-абмеркаванне “Если с другом вышел в путь”.** Бібліятэкар распавяла прысутным, што ва ўсе часы і ва ўсіх народаў вельмі высока шанавалася сяброўства, вернасць, адданасць. Удзельнікі ўспомнілі прымаўкі аб сяброўстве, чыталі вершы, разважалі аб тым, хто такія сапраўдныя сябры. Скончылася мерапрыемства прачытаннем мудрай прыпавесці.



**29 кастрычніка** ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшло чарговае пасяджэнне клуба “Истоки” – **ўрок дабрыні “Высокое слово Милосердие”.** Бібліятэкары распавялі дзецям, што такое міласэрнасць. Яно азначае “мілае сэрца”. Гэта паняцце выйшла з рэлігіі і азначае любоў да бліжняга. Таксама прысутныя пазнаёміліся з творам вядомага пісьменніка Валянціна Распуціна “Уроки французского”, абмеркавалі, што дабрата - чалавечая якасць, якая з'яўляецца асноўнай ў героях твора.

**29 кастрычніка** ў **Межанскай сельскай бібліятэцы** прайшла **гадзіна казкі “По дорогам волшебных сказок”**, прысвечаная творчасці нямецкага казачніка Вільгельма Гаўфа. Дзеці даведаліся аб тым дзе нарадзіўся і як жыў пісьменнік, аб казачных гісторыях, створаных аўтарам, у якіх іх чакаюць цудоўныя ператварэнні і чароўныя прыгоды.



**30 кастрычніка** бібліятэкар **Верамееўскай сельскай бібліятэкі** сумесна з супрацоўнікамі ДУК “Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Верамееўскі сельскі дом культуры правялі для дзяцей **гульнявую праграмму “И страшно, и смешно”.** Маленькія чытачы сабраліся пагуляць і павесяліцца ў гонар удалага заканчэння першай чвэрці і пачатку восеньскіх канікулаў, а таксама адзначыць Хэлуін. Бібліятэкар-вядучая распавяла гісторыю свята і яго ўзаемасувязь са святам Каляды. Пагулялі ў гульню-шумелку, адгадвалі загадкі, прайшлі шмат выпрабаванняў: “Полеты на метле”, “Бешеная тыква”, “Страшилка-повторялка”. Пасля насычанай гульнявой праграмы адбылася дыскатэка.




